Г. Ю. Лазук

# КАШТОЎНАСЦІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ: НАРОДНЫ АБРАД «КАЛЯДНЫЯ ЦАРЫ»

Абрад "Калядныя цары" – традыцыйны навагодні народны абрад у вёсцы Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Свята ўключае ў сябе калядаванне і элементы народнай драмы "Цар Максілілян". У гурт калядных "цароў" уваходзяць 7 маладых хлопцаў, якія апрануты ў белыя кашулі и штаны, падперазаны чырвонымі семежаўскімі паясамі з геаметрычным арнаментам. Грудзі таксама перавязаны крыжнакрыж паясамі, на шыю павязана жаночая хустка-"тарыноўка" ў вялікую клетку або ў кветкі, канцы якой закладваюцца за паясы. Усе ў чорных ботах. На галаве – высокія папяровыя шапкі, аздобленыя markdown рознакаляровымі стужкамі. Ва ўсіх "цароў" з левага боку прымацавана самаробная шабля. Кожны з "цароў" меў пэўнае імя – цар Максімілян, цар Мамай, цар Іван Грозны і г.д. і паводзіць сябе ў адпаведнасці з гэтым вобразам. Акрамя "цароў" у калядным гурце знаходзіцца "лекар", музыка, барабаншчык і механоша. Гэта – так званыя "чыстыя маскі". У складзе гурта былі і "нячыстыя маскі": "дзед" і "баба. Ролі "дзеда" і "бабы" выконвалі хлопцы, апранутыя ў бруднае, рванае адзенне, твары вымазаны сажай. На ролю "бабы" бралі невысокага, рухавага хлопца [1, с. 21]. Задачай гэтых персанажаў было смяшыць гледачоў, рабіць усялякую шкоду, абдымацца і цалавацца паміж сабой і з прысутнымі, красці рэчы ў гаспадароў.

"Цары" выходзілі на вуліцу, выстройваліся па росту. Першы ў шарэнзе, самы высокі і прыгожы ўдзельнік каляднай талакі, - цар Максімілян. Ён сімвалізуе рускага цара. Сярод астатніх вылучаецца Мамай, апрануты ва ўсё чырвонае. Гэта цар прышлы, азіяцкі. Заключнымі ідуць барабаншчык з музыкам і механоша. Механоша вязе за сабой санкі, на якіх стаіць стул у выглядзе трона – сімвала ўлады "цароў". Кіруе "царамі" "лекар" у вайсковай форме. Куды загадае, туды хлопцы ідуць. Маршыруюць пад гукі барабана, па баках бягуць "дзед" і "баба". У руках "дзеда" – пуга, у "бабы" – мяцёлка, якой яна замятае дарогу, каб збіць цароў з намечанага маршруту. У першую чаргу "цары" заходзяць у хаты незамужніх дзяўчат, паказваюць прадстаўленне, выказваюць добрыя пажаданні гаспадарам, а ў адказ атрымліваюць падарункі. Прадстаўленне цягнецца не больш за 15 хвілін і надае шмат весялосці і пазітыўнай энергіі. Паміж "царамі" – рускім Максімілянам і азіяцкім Мамаем адбываецца паядынак на шаблях, у выніку якога перамогу атрымлівае цар Максімілян. Востры на язык лекар бярэцца ўсіх лячыць, але робіць гэта не лекамі, а гумарам. "Баба" і "дзед" у гэты час выбраляюць усё, што ўдумаюць, не пакідаючы без увагі прысутных. Закончыўшы прадстаўленне ў адной хаце і атрымаўшы пачастункі, "цары" ў суправаджэнні гасцей і мясцовых жыхароў наведвалі хату за хатай. Лічылася, што "цары" неслі надзею на шчасце і дабрабыт у новым годзе. За сваю унікальнасць у 2007 г. абрад "Калядныя цары" быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [2]. А ў 2009 г. абрад "Калядныя цары" рашэннем IV Сесіі Міжурадавага камітэта UNESCO быў уключаны ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якой патрабуецца тэрміновая ахова [3]. Абрад "Калядныя цары" – першы аб'ект нематэрыяльнай спадчыны ў нашай краіне, ўзяты пад ахову UNESCO.

### *Список литературы*


1. 1. Кухаронак, Т. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001.
2. 2. Гурло, Г. "Цары" пад аховай дзяржавы / Г. Гурло // Слава працы. – 2008. – №8.
3. 3. Антановіч, К. Цары ў спісе спадчыны / К. Антановіч // Беларусь сегодня. – 2009. – 6 октября.


*Герман Юрьевич Лазук*, студэнт 1 курса Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, gsombrero@mail.ru
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by